**10 мая 2024 г. — 120 гадоў з дня нараджэння Аляксея Васільевіча Грышкоўскага (I904-1990), генерал-маёра артылерыі**



Аляксей Васільевіч Грышкоўскі нарадзіўся 10 мая I904 года ў в. Мярніца Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. Галоўнай каштоўнасцю і здабыткам сям'і, якая складалася з сямі чалавек, быў невялікі надзел зямлі, дзякуючы якому яны і выжывалі. У 1915 годзе Аляксей скончыў чатырохкласную сельскую школу ў суседняй вёсцы Мацы. Вельмі любіў чытаць і да 11 гадоў перачытаў усе кнігі, якія былі ў мясцовай хаце-чытальне.

Невядома, як склаўся б далейшы лёс Аляксея, каб не Першая сусветная вайна. Ваеннае ліхалецце занесла сям'ю Грышкоўскіх на чужыну - у расійскую глыбінку. Па дарозе на адным з прыпынкаў Аляксей адстаў ад цягніка, і родныя, якія даехалі да Тамбова, доўгі час не мелі аб ім ніякіх звестак і лічылі загінуўшым. Аляксея тым часам падабралі войскі Чырвонай арміі, дзе ён стаў сынам палка і палкавым пісарам.

Жыццё ва ўмовах Грамадзянскай вайны з яе суровым ваенным побытам і вызначыла выбар ваеннай прафесіі. У Чырвоную армію юнак уступіў 3 лістапада 1918 года ва ўзросце 15 гадоў. 3 лістапада 1918 года па красавік 1919 года Аляксей быў чырвонаармейцам 7-га запаснога батальёна ў горадзе Лебядзянь Тамбоўскай вобласці. 3 красавіка па верасень 1919 года знаходзіўся ў складзе 74-га стралковага

палка 9-й стралковай дывізіі 13-й арміі Паўднёвага фронту, а з верасня 1919 года па люты 1922 года - чырвонаармеец 23-га стралковага палка 3-й Казанскай стралковай дывізіі Крымскага фронту.

У 1922-1923 гадах Аляксей Грышкоўскі – курсант 64-х Феадасійскіх пяхотных камандных курсаў, якія ажыццяўлялі падрыхтоўку сярэдняга і малодшага каманднага і палітычнага саставу. Пасля вучобы прызначаны камандзірам аддзялення ў 7-м стралковым палку 3-й Казанскай стралковай дывізіі.

Кар'ера імкліва развівалася. Са снежня 1923 года А. В. Грышкоўскі ўжо камандаваў вучэбным узводам 3-га артпалка 3-й Крымскай стралковай дывізіі, затым камандзірам батарэі артылерыйскага дывізіёна 9-га стралковага палка. У чэрвені 1932 года прызначаны камандзірам 5-й асобнай Кіеўскай аўтароты. Дарэчы, пазней камандзірам Крымскай стралковай дывізіі быў зямляк А. Грышкоўскага - Максім Антанюк, генерал-лейтэнант, ураджэнец в. Мацы.

Шлях тых, хто імкнуўся стаць высокакваліфікаваным спецыялістам, ляжаў праз артылерыйскія курсы ўдасканалення камсаставу і праз артылерыйскую акадэмію. Са снежня 1932 года па студзень 1937 года Аляксей Грышкоўскі вучыўся ў Ваеннай артылерыйскай акадэміі імя Ф. Э. Дзяржынскага (цяпер Ваенная акадэмія ракетных войск стратэгічнага назначання імя Пятра Вялікага).

У 1937 годзе ў краіне пачалася хваля рэпрэсій. Дбайную праверку праходзіў і Аляксей Грышкоўскі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР правяраліся і «польскія карані» сям'і Грышкоўскіх. Дзякуючы гэтаму сваякі нарэшце

даведаліся, што Аляксей жывы, і тады і праваліўся міф пра заможнае польскае сямейства Грышкоўскіх.

У 1939 годзе, праз 22 гады, упершыню за доўгія гады патрапіў у родныя мясціны. Але да моманту яго прыезду бацькі ўжо памерлі, сустрэлі яго толькі брат і дзве сястры. Пасля вяртання з водпуску яго чакала новае прызначэнне на пасаду начальніка штаба палка 138-га артпалка РГК у Растоў-на-Доне, да сакавіка 1941 года быў выконваючым пасаду камандзіра палка.

Вялікую Айчынную вайну маёр А. В. Грышкоўскі пачаў пад Ленінградам. Са снежня 1941 года баявы шлях праходзіў у складзе 353-й стралковай дывізіі 56-й Асобнай арміі Паўднёвага фронту. За абарону Данбаса, Растова, Краснадарскага краю і Каўказа 8 кастрычніка 1942 года ён атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. У снежні 1942 года прысвоена званне палкоўніка. У баях з нямецкімі захопнікамі на Кубані палкоўнік Грышкоўскі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У сакавіку 1943 года прызначаны камандуючым артылерыяй 22-га стралковага корпуса 18-й арміі, якая вяла напружаныя баі на бердзічаўскім кірунку паўднёвей Жытоміра. За паспяховае правядзенне аперацыі быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені (3.01.1944).

У канцы красавіка 1944 года А. В. Грышкоўскі прызначаны часова выконваючым абавязкі камандуючага артылерыяй 2-й арміі Войска Польскага, якая з 19 сакавіка 1944 года ўвайшла ў склад 1-га Украінскага фронту пад камандаваннем І. С. Конева. Улетку 1944 года прымаў удзел у вызваленні заходніх раёнаў Украіны. За ўмелае кіраўніцтва

палкоўнік Грышкоўскі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, у жніўні 1944 года - ордэнам Суворава II ступені. Вайну закончыў у Германіі камандуючым артылерыяй 18-й арміі ў чыне генерал-маёра. Узнагароджаны ордэнам Леніна (21.02.1945), ордэнам Чырвонага Сцяга (27.06.1945).

З красавіка 1948 года па красавік 1949 года вучыўся ў Вышэйшай ваеннай акадэміі імя К. Я. Варашылава ў Маскве. Камандаваў артылерыяй у Прыморскай і Паўночна-Каўказскай ваенных акругах.

У сакавіку 1956 года ў Акадэміі імя Л. А. Говарава (пазней Харкаўскі ваенны ўніверсітэт) створаны факультэт спецыяльнай тэхнікі (наземнага і бартавога электра-абсталявання зенітных ракет), начальнікам якога быў прызначаны генерал-маёр артылерыі А. В. Грышкоўскі. Акадэмія рыхтавала першых спецыялістаў-ракетчыкаў.

У 1961 годзе выйшаў у запас з правам нашэння ваеннай формы адзення. Да 1964 года ўзначальваў саўгас у Харкаўскай вобласці.

Аляксей Васільевіч Грышкоўскі памёр 5 сакавіка 1990 года. Пахаваны на Другіх воінскіх могілках горада Харкава.

Матэрыял падрыхтаваны ў ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Грышкоўскі Аляксей Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка – дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 432 : фота. - (Імі ганарацца землякі).

**Долготович, Б. Д**. Командный состав Красной армии в годы Великой Отечественной войны (1941-1945): генералы-адмиралы – белорусы и уроженцы Беларуси : пособие рекомендовано учебно-методическим объединением по военному образованию / Б. Д. Долготович, Д. А. Козел. – Минск : БНТУ, 2018. – 72 с.

См. на с. 43.

**120 гадоў** з дня нараджэння А. В. Грышкоўскага (1904) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 119-120.

**Известные люди.** Гришковский Алексей Васильевич // Азбука моей малой родины : 505-летию Стригово посвящается / ГУК «Стриговская публичная библиотека», ГУО «Стриговский детский сад - средняя школа», ГУК «Стриговский центр культуры и досуга» ; под ред. С. Д. Курачук, гл. библиографа Кобрінской центральной районной библиотеки - Кобрин : Центральная районная библиотека, 2018. - С. 11 : фот.

**Сузор'е кобрынскіх вёсак** : рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс да 450-годдзя з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах вёсак Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2013. - С. 102-103. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**#Равнение** на героев. Генерал из народа : [о генерале Алексее Гришковском, уроженце деревни Мерница Кобринского района] / подготовила Жанна Елизарова по материалам личного архива семей Сыч-Тунчик // Кобрынскі веснік. 2023. 23 верасня (№ 60). С. 14—15 : фот.

Кобрынскі раён

Мярніца

Грышкоўскі Аляксей Васільевіч

Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны

Генералы